Converted by Total Image Converter - (no stamps are applied by registered version)



# БЕЛАРУСКАЯ РЭСПУБЛІКАНСКАЯ НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЯ РАДА ПА ПЫТАННЯХ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ ПРЫ МІНІСТЭРСТВЕ КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## ПРАТАКОЛ № 115

20. 12. 2005 г. г. Мінск

Прысутнічалі:

| | |
|---|---|
| В.Я. Абламскі | старшыня Навукова-метадычнай рады (НМР), начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь |
| І.М. Чарняўскі | намеснік старшыні НМР, намеснік начальніка упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры |
| В.Ф. Міхайлава | вучоны сакратар НМР, намеснік начальніка аддзела упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры |
| А.І. Лакотка | дырэктар інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, доктар архітэктуры, доктар гістарычных навук, прафесар, Член-карэспандэнт НАН Беларусі |
| А.І.Мартынаў | галоўны архітэктар ТАА "ИВ" |
| Н.Ф.Высоцкая | загадчык аддзела старажытна–беларускага мастацтва Нацыянальнага мастацкага музея РБ, доктар мастацтвазнаўства, прафесар |
| В.С. Вяргей | старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі, старшыня Палявога камітэта |
| Т.Б.Варфаламеева | старшы навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы НАН Беларусі, кандыдат мастацтвазнаўства |

Converted by Total Image Converter - (no stamps are applied by registered version)



культурнай і прыроднай спадчыны аб'ектаў і ўстаноўленых вакол іх буферных зон.

3). Ухваліць прадстаўленае праектнае рашэнне для далейшага праектавання з улікам:

3.1 магчымасці выкарыстання варыянта з транзітам праз дваравую тэрыторыю або арганізацыі замкнёнага контура квартала, кіруючыся:

3.1.1 найбольш даставернай перадачай яго характару на фотафіксацыі горада 30-х гадоў 20 стагоддзя;

3.1.2. выяўлення і зберажэння ў структуры забудовы квартала адметных па сваіму гістарычнаму функцыянальнаму і вобразнаму характуру будынкаў.

4) Рабочы праект прадставіць на узгадненне ў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Прагаласавалі: "за" – 7; "ўстрымаўся" – 1.

**2. Разгляд і абмеркаванне эскізнага праекта па аб'екту "Аб'ёмна – прасторавае рашэнне прыдарожнага сэрвіса на 51 км МКАД"**

Выступілі: А.Г.Шчапіла, І.С.Лебедзева, М.Т.Кляшторная, А.І.Мартынаў, В.Я.Абламскі, І.М.Чарняўскі, В.Ф.Міхайлава, Т.Б.Варфаламеева, В.С.Вяргей

Разгледзеўшы эскізны праект па аб'екту "Аб'ёмна прасторавае рашэнне прыдарожнага сэрвіса на 51 км МКАД" члены НМР ВЫРАШЫЛІ:

1) Ухваліць эскізны праект па аб'екту "Аб'ёмна прасторавае рашэнне прыдарожнага сэрвіса на 51 км МКАД", з улікам адпаведнасці падрыхтаванай дакументацыі рэжыму утрымання зоны рэгулюемай забудовы, вызначанай у складзе схемы зон аховы матэрыяльнай нерухомай гісторыка-культурнай каштоўнасці першай катэгорыі "Месца згубы ахвяр палітычных рэпрэсій 30-40 гадоў XX стагоддзя ва ўрочышчы Курапаты", якая зацверджана пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 12 мая 2004г. № 15 і заключэння Міністэрства культуры ад 28 лістапада 2005 года № 01-05/587.

2) Прапанаваць Міністэрству культуры узгадніць разглядаемы праект для далейшай рэалізацыі.

Прагаласавалі: "за" – 8; "супраць" – 0.